Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма

Сектар краязнаўства цэнтральнай бібліятэкі

Інфармацыйна-бібліяграфічны сектар цэнтральнай бібліятэкі



# да 70-годдзя УА "Пінскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж імя А.Я. Кляшчова"

## шорт-ліст

Пінск, 2016

Пінск яшчэ ляжаў у руінах, калі ў 1946 годзе ў старым будынку па вуліцы Кірава, 24 адбылося адкрыццё новай у горадзе навучальнай установы – **гідрамеліяратыўнага тэхнікума.**

Загадам па Міністэрству земляробства СССР ад 14. 10. 1946 года №810 «Аб арганізацыі меліярацыйнага тэхнікума ў г. Пінску» замест сельскагаспадарчага тэхнікума быў арганізаваны Пінскі меліярацыйны тэхнікум.

У верасні 1946 года тэхнікум узначаліў Дамаркоў Арцём Мінаевіч, які праводзіў вялікую работу па станаўленню навучальнай установы. Паспяхова быў праведзены прыём навучэнцаў па ўсіх спецыяльнасцях. Падабраўся дружны калектыў выкладчыкаў, гатовых аддаць усе свае сілы і веды будучым меліяратарам.

З 1 студзеня 1948 года Пастановай Савета Міністраў БССР ад 27. 01. 1948 года № 84 навучальная ўстанова стала называцца **"Пінскі гідрамеліяратыўны тэхнікум".**

Першыя выпускі былі не шматлікія. Дастаткова саслацца на той факт, што ў перыяд 1951 – 1955 гадоў дыпломы тэхніка-меліяратара атрымалі каля 300 чалавек.

З 1951 па 1966 г. г. кіраваў тэхнікумам інжынер-геадэзіст **Лапіцкі Іван Мікалаевіч**, які правільна вызначыў асноўныя напрамкі развіцця тэхнікума з улікам патрэбы меліярацыйнай вытворчасці ў высока кваліфікаваных спецыялістах. За дадзены перыяд быў пабудаваны галоўны навучальны корпус, два добраўпарадкаваных інтэрната на 256 месцаў кожнае, жылы 32-кватэрны дом для работнікаў тэхнікума. Паступова ствараліся кабінеты, лабараторыі па ўсіх спецыяльнасцях. У 1961 годзе адкрываюцца новыя спецыяльнасці «Механізацыя меліярацыйных і водагаспадарчых работ», «Землеўпарадкаванне».

У 1959 годзе тэхнікум справіў наваселле ў будынку па вуліцы Астроўскага (зараз Іркуцка-Пінскай дывізіі).

З 1966 па 1997 гг. кіраваў тэхнікумам заслужаны меліяратар БССР **Пастухоў Васіль Фядосавіч**. Шмат сіл Васіль Фядосавіч аддаў тэхнікуму. Ён з'яўляецца сааўтарам падручніка «Сельскагаспадарчая меліярацыя», навучальнага дапаможніка «Курсавое і дыпломнае праектаванне» па спецыяльнасці «Меліярацыя і водная гаспадарка». За перыяд з 1970 по1985 гг. былі пабудаваны: інтэрнат на 500 месцаў, жылы 60-кватэрны дом, майстэрні на 600 навучэнцаў, прафілакторый на 58 месцаў, праведзена рэканструкцыя старога навучальнага корпуса. З 1971 года была адкрыта спецыяльнасць «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», а з 1991 года «Будаўніцтва аўтамабільных дарог і транспартных аб'ектаў». У 1970 годзе ў мэтах увекавечання памяці Героя Савецкага Саюза А.Я. Кляшчова Пінскаму гідрамеліяратыўнаму тэхнікуму прысвоена яго імя.

З 1997 па 2005 гг. тэхнікум ўзначаліў **Гарошка Васіль Майсеевіч**, Герой Сацыялістычнай Працы, кандыдат сельскагаспадарчых навук. Пры ім у 2003 г. загадам №168 ад 28.05.2003 г. Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь тэхнікум быў перайменаваны ў **«Пінскі**

**дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж ім. А. Я. Кляшчова».** У 2001г. была адкрыта спецыяльнасць «Рамонтна-абслугоўваючая вытворчасць у сельскай гаспадарцы». В.М. Гарошка вялікую ўвагу надаваў развіццю самастойнай працы навучэнцаў, дэмакратызацыі навучальнага працэсу, умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы.

З 2005г. па 2011г.г. каледж узначальваў **Князюк Мікалай Іванавіч.** Мае ўзнагароды: Знак пашаны, ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Пры ім пачаты капітальны рамонт галоўнага вучэбнага корпуса. У 2006г. створана Асацыяцыя з Беларускім аграрна-тэхнічным універсітэтам і Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам прыродаўстройства.

З 2012 г. і па сённяшні дзень дырэктарам каледжа з'яўляецца **Прытульчык Васіль Васільевіч.** Узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Выдатнік адукацыі" . Пад яго кіраўніцтвам абноўлена вучэбна-вытворчая база, набыта больш за 8 адзінак сучаснай тэхнікі для адукацыйнага працэсу.

Створаны ўмовы для ўкаранення інавацый і рэалізацыі ініцыятыў педагагічнага калектыву, накіраваных на паляпшэнне працы каледжа і павышэнне якасці адукацыі. Актывізавана праца па ўдасканаленні формаў і метадаў адукацыйнага працэсу. Пацвярджэннем таму з'яўляецца той факт, што навучальная ўстанова адна з першых у горадзе і адна з нямногіх сярод сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў аграрнага профілю ў рэспубліцы. Прытульчык В. В. выступае ініцыятарам і каардынуе працу каледжа па ўдзелу ў Рэспубліканскіх конкурсах прафесійнага майстэрства, аглядах-конкурсах творчых аб'яднанняў, навукова-практычных канферэнцыях, выставах тэхнічнай творчасці, спартакіядах. Па ўсіх гэтых напрамках каледж займае лідзіруючае становішча.

Асаблівая ўвага надаецца вытворчаму навучанню праз конкурсы прафесійнага майстэрства "Лепшы па прафесіі". Захоўваюцца лепшыя традыцыі і забяспечваецца пераемнасць педагагічнага калектыву з ветэранамі працы.

З мэтай павышэння эфектыўнасці выхаваўчага працэсу праводзіцца работа па абнаўленню экспанатаў музея каледжа.

У 2015годзе ў гонар 70 -годдзя Вялікай перамогі закладзены фруктовы сад з 70 дрэў.

У 2016годзе ў гонар 70-годдзя каледжа пасаджана алея вечназялёных туй.

Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што у тым, што зроблена ў рэспубліцы па меліярацыі зямель, вялікая заслуга тых многіх тысяч кадраў-гідратэхнікаў, механікаў, якіх клапатліва выхаваў Пінскі гідратэхнікум. Адны з першых выпускнікоў, на чые плечы лягла галоўная задача па пераўтварэнню роднай зямлі – гэта Леанід Іванавіч Бердзічэвец, Аляксей Аляксеевіч Шахновіч, Аляксандр Трафімавіч Кароткі, Пётр Іосіфавіч Лукашык, Аляксандр Мікалаевіч Фёдараў, былы завуч тэхнікума Якаў Сямёнавіч Ліўшыц і многія многія іншыя.

На сучасным этапе ў каледжы ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па чатырох спецыяльнасцях на дзённай і завочнай формах навучання. Ва ўстанове адукацыі ёсць аддзяленне павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, на якім ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, падрыхтоўка і перападрыхтоўка па вялікім шэрагу прафесій.

## ЗАСЛУЖАНЫЯ ВЫКЛАДЧЫКІ

У тэхнікуме працавалі заслужаныя настаўнікі БССР. Сярод выкладчыкаў маюць ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» - Александроўская Вольга Іванаўна, Вярыга Эраст Сцяпанавіч, Новікава Валерыя Канстанцінаўна.

Узнагароджаны значком Мінвуза СССР «За выдатныя поспехі ў сярэдняй адукацыі» выкладчыкі: Гурманчук Міхаіл Юльянавіч, Корзун Лідзія Васільеўна, Субат Аляксандр Данілавіч, Усціненка Уладзімір Свірыдавіч, Ясковіч Тамара Мікітаўна.

Вялікі ўклад у станаўленне каледжа ўнеслі **выкладчыкі-ветэраны:** Пузырова Т. С., Танкавід С. Е., Рагінская А. М., Ясковіч Г. Н., Чумакевіч С. Ф., Высочына В. Г., Галац З. П., Свістунова А. А., Дзікавіцкая Т. В., Ермакова М. В., Шкабара Л. Ф., Шарыхін В. М., Гурманчук М. Ю., Гурманчук Е. А., Трыволь А. Ф., Бразоўскі І. М., Барэйша В. К., ТрушкоП. Ст., Хахлова Р. Р., Маслава, М. І., Калугіна А. І., Усціненка В. С.,, Корзун Л. В., Нікуліна А. І., Дрылёў В. Ф., Дрылёва Р. П., Дамбек Е. Г., Л. Карасёва Г, Бурлак А. І., Т. А. Ясеніна, Галушго А. Ф., Цуба Е. С., Чорны А. І., Аленькаў П. С., Кураленя М. Б., Мялешка Г. Зн., Мялешка А., Дазорцава Л. П., Дазорцаў Д. П., Сцепаненка Д. Н., Кісель С. А., Гаршкова Г. П., Еўтуховіч Г. В., Шапавалава Л. П., Л. І. Карняйчук і інш.

## Бібліяграфія:


1. **Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці** : да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А. М. Літвін [і інш.]. — Мінск : Вышэйшая школа, 2012. — С. 226—559 ; С. 610—614 ; С. 681—688.
2. **Пінскі гідрамеліярацыйны тэхнікум імя А. Я. Кляшчова** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 2001. Т. 12. С. 369.
3. **Пинский аграрно-технический колледж имени А. Е. Клещёва** // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. Минск, 2008. Т. 6. С. 67.
4. **Пинский государственный аграрно-технический колледж имени А. Е. Клещёва** // Регионы Беларуси : энциклопедия. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. Минск, 2009. Кн. 2. С. 217.

5. **Литвин, Е.** Работа от зари до зари : [учащийся аграрно-технического колледжа Артем Мокей принял активное участие в хлебоуборочной кампании] / Екатерина Литвин ; фото Анны Веренич // Пінскі веснік. 2016. 30 верасня (№ 79). С. 4.
6. **Ляшук, М. І.** Жніво і ...псіхалогія : навучэнцу Пінскага аграрна-тэхнічнага каледжа імя А. Я. Кляшчова Арцёму Макею ўзнагароду ўручыў кіраўнік Брэстчыны Анатоль Ліс / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. 2016. 30 верасня (№ 40). С. 9.
7. **Зрабіць свой выбар** : [Дзень прафарыентацыі для навучэнцаў аграрна-тэхнічнага каледжа прайшоў у Пінскім аўтобусным парку] / Служба навін "НТ" // Народная трыбуна. 2016. 17 чэрвеня (№ 25). С. 3.
8. **Ильяшевич, А.** С прицелом на профессию : [День профориентации для учащихся аграрно-технического колледжа прошел в Пинском автобусном парке] / Анна Ильяшевич ; фото Вячеслава Ильенкова // Пінскі веснік. 2016. 14 чэрвеня (№ 48). С. 2.
9. **Лешкевич, Н.** Играть на гитаре, виолончели, контрабасе? Легко! : [об учащемся аграрно-технического колледжа Андрее Сачковском] / Наталья Лешкевич ; фото Анны Веренич // Пінскі веснік. 2016. 20 мая (№ 41). С. 12.
10. **Белоус, М.** Показали мастерство : [учащиеся аграрно-технического колледжа и индустриально-педагогического колледжа приняли участие в конкурсе профессионального мастерства, который прошел на базе сельскохозяйственной академии] / Максим Белоус ; Сергей Рубец // Полесская правда. 2016. 30 апреля (№ 35). С. 9.
11. **Гришковец, В. Ф.** Северный шелк: знакомый незнакомец : в Пинском аграрно-техническом колледже организовали праздник, посвященный льну / Валерий Гришковец ; фото Натальи Милевской // Заря. 2016. 23 апреля (№ 46). С. 5.
12. **Жук, А.** Лён - продкам паклон, модзе - пашана : [мерапрыемствы ў Пінскім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжы імя А. Я. Кляшчова] / Алена Жук // Пінскі веснік. 2016. 15 красавіка ( № 31). С. 3.
13. **Гурманчук, Е.** Добрая традиция : [УО "Пинский государственный аграрно-технический колледж имени А. Е. Клещева" в честь 70-летия Победы пригласил ветеранов педагогического труда] / Елизавета Гурманчук и др. ветераны педагогического труда // Полесская правда. 2015. 16 чэрвеня (№ 48). С. 3.
14. **Милевская, Н.** ...И зашумит яблоневый сад : [учащиеся УО "Пинского государственного аграрно-технического колледжа имени А. Е. Клещева" в честь 70-летия Победы посадили фруктовый сад] / Наталья Милевская ; фото автора // Полесская правда. 2015. 25 апреля (№ 32 - 33). С. 12.
15. **Гришковец, В. Ф.** Саду Победы расти : [учащиеся УО "Пинского государственного аграрно-технического колледжа имени А. Е. Клещева" в честь 70-летия Победы посадили фруктовый сад] / Валерий Гришковец // Заря. 2015. 23 апреля (№ 45). С. 17.

16. **Владимирова, А.** И будет сад цвести : [учащиеся УО "Пинского государственного аграрно-технического колледжа имени А. Е. Клещева" в честь 70-летия Победы посадили фруктовый сад] / Анна Владимирова ; фото автора // Полесская правда. 2015. 18 апреля (№ 31). С. 3.
17. **Ильенков, В. Л.** Победы саду цвесть! : [учащиеся УО "Пинского государственного аграрно-технического колледжа имени А. Е. Клещева" в честь 70-летия Победы посадили фруктовый сад] / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. 2015. 17 красавіка (№ 31). С. 2.
18. **Терлецкая, Ася.** 65 - не возраст! Всё только начинается! : [аграрно-технический колледж] / Ася Терлецкая // Пінскі веснік. 2011. 16 снежня (№ 100). С. 4.
19. **Техникум стал колледжем** : [Пинский государственный гидромелиоративный техникум приказом Министерства сельского хозяйства и продовольствия по согласованию с другими министерствами переименован в «Пинский государственный аграрно-технический колледж им. А. Е. Клещева»] // Пінскі веснік. 2003. 3 чэрвеня. С. 1.
20. **Еленевский, Н.** Профессия на все времена : [гидромелиоративный техникум] / Н. Еленевский // Полесская правда. 2003. 22 января. С. 1.
21. **Шапиро, С.** Большая жизнь : [гидромелиоративному техникуму – 55 лет] / С. Шапиро // Полесская правда. 2000. 9 августа. С. 3.
22. **Федченко, Г.** Василий Горошко – директор техникума : [гидромелиоративный техникум] / Г. Федченко // Пінскі веснік. 1997. 28 студзеня.
23. **Пинскому гидротехникуму им. А. Е. Клещёва исполнилось 50 лет!** : История учебного заведения в именах, цифрах и фактах // Пинская неделя. 1996. 25 октября.
24. **Александрова, Н.** Открывая новые страницы : Пинскому гидромелиоративному техникуму им. А. Е. Клещёва исполнилось 50 лет! / Александрова Н. // Полесская правда. 1996. 23 октября.
25. **Кирковец, Н.** Пинскому гидротехникуму - 50 лет : визитная страничка / Н. Кирковец // Пінскі веснік. 1996. 22 кастрычніка.
26. **Поливко, Н.** Спасибо, техникум, тебе! : Пинскому гидротехникуму им. А. Е. Клещёва исполнилось 50 лет / Н. Поливко // Живая вода. 1996. 19 октября.
27. **Пастухов, В.** Трудовое воспитание будущих специалистов : [гидромелиоративный техникум] / В. Пастухов // Пинская правда. 1962. 20 октября.
28. **Пинский государственный аграрно-технический колледж им. А. Е. Клещёва** : официальный сайт [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://pgatkk.by
29. **Пинский государственный аграрно-технический колледж им. А. Е. Клещёва** : сайт Бреста – bug.by [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://bug.by/pinskij-gosudarstvennyj-agrarnotehnicheskij-kolledzh-im-ae-

kleshheva
**Средние специальные учебные заведения РБ** : УО «Пинский государственный аграрно-технический колледж им. А. Е. Клещёва» [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://kudapostupat.by/zavedenie/id/114
30. **Средние специальные учебные заведения в Пинске** : УО «Пинский государственный аграрно-технический колледж им. А. Е. Клещёва» [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://pinsk.eu/srednie-specialnye-uchebnye-zavedeniya/uopinskij-gosudarstvennyj-agrarno-tehnicheskij-kolledzh-im-e-klesheva-1

Выканаўцы:
*Баговіч Т.К., галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦБ*
*Гарачова А.Н., галоўны бібліёграф  аддзела абслугоўвання і інфармцыі*
Кастрычнік , 2016